

КУПІЦЬ ДОМ У АРТ-ВЁСЦЫ **5**

ШТО ПРАПАНУЕ «БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ВОСЕНЬ» **9**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛІСТАПАДА 2021 г. СУБОТА № 220 (29589)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КІЙКА, першы намеснік міністра фінансаў:**

*«На сёння нейкія істотныя змены падатковай мадэлі ў частцы дадатковага падаткаабкладання звышспажывання або прагрэсіўнай шкалы ставак падаходнага падатку намі не разглядаюцца. Мы лічым, што яны не дадуць значных фіскальных эфектаў, у тым ліку ў сувязі з тым, што ў нас у Беларусі невялікае маёмаснае расслаенне, у тым ліку па даходах грамадзян. Акрамя таго, можа ўскладніцца падатковае адміністраванне. На думку Мінфіна, падатковая сістэма павінна трансфармавацца ў частцы пашырэння падатковай базы. Пры гэтым мы не забываемся аб тым, што павінны захоўвацца стымуляцыйныя меры, якія будуць падтрымліваць і забяспечваць эканамічны рост».*

# ТАМУ ШТО МЫ — ЛЮДЗІ



Фота БелТА.

**На нарадзе ў чацвер Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на дапамогу бежанцам, якія працягваюць заставацца на граніцы з Польшчай, не страчваючы надзеі трапіць у Еўрасаюз. Беларусы не могуць не адгукнуцца на чужую бяду, тым больш калі размова ідзе пра жанчын і дзяцей. Учора ў лагер бежанцаў даставілі дровы для абагрэву. Працягваюць прыходзіць і машыны з гуманітарным грузам — дапамогу збіраюць нераўнадушныя людзі ва ўсіх рэгіёнах краіны.**

Сітуацыя на беларуска-польскай граніцы знаходзіцца на пастаянным кантролі Савета Рэспублікі, паведаміла ўчора журналістам старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

«Па даручэнні Прэзідэнта Саветам Рэспублікі пытанне аказання дапамогі дзецям, жанчынам, якія сёння знаходзяцца ў такіх няпростых умовах на беларуска-польскай граніцы, узята на кантроль. Мы вызначылі, што там пастаянна будзе знаходзіцца старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Віктар Лісковіч, — расказала Наталля Качанава. — Ён будзе камунікаваць з бежанцамі. Мы акажам жанчынам і дзецям медыцынскую і іншую неабходную дапамогу. Магчыма, проста для таго, каб нейкі час яны маглі адпачыць у нармальных чалавечых умовах. Паколькі тыя ўмовы, у якіх сёння яны знаходзяцца, бесчалавечныя. Таму мы зробім усё, каб аказаць дапамогу людзям. І гэта будзе знаходзіцца на нашым пастаянным кантролі да моманту вырашэння гэтай сітуацыі».

Спікер нагадала, што сенатары, члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі Саюза жанчын верхняй палаты парламента наведалі граніцу і аказалі гуманітарную дапамогу бежанцам. «Яны сустракаліся з бежанцамі. Убачылі ўсю тую жудасную сітуацыю, у якой людзі знаходзяцца. Калі яны пачалі расказваць нам аб гэтым падчас круглага стала ў Савеце Рэспублікі, іх душылі слёзы. І намі гэта было ўспрынята як асабістая трагедыя. Мы, беларусы, як ніхто ведаем, што такое голад, холад. Гэта перажылі нашы старэйшыя пакаленні, калі Беларусь была ў акупацыі. Тое, што сёння робяць польскія ўлады ў адносінах да гэтых людзей, — не проста бесчалавечна, гэта цынічна і недапушчальна. Таму, вядома, мы адгукнуліся і будзем рабіць усё магчымае для таго, каб дапамагчы гэтым людзям», — адзначыла спікер.

Наталля Качанава дадала, што сёння шмат неабыякавых беларусаў суперажываюць бежанцам і гатовы аказаць ім неабходную дапамогу, перадаць ежу, адзенне. «І мы зрабілі так, каб гэта было цэнтралізавана праз Чырвоны Крыж», — падкрэсліла старшыня Савета Рэспублікі.

*Аб тым, як арганізоўваецца дапамога, — на 3-й стар.*

## КОРАТКА

- **Мазырскі НПЗ упершыню выпусціў бензін з актанавым лікам 101.**
- «Белавія»: грамадзяне Ірака, Сірыі, Емена не будуць прымацца на рэйсы з Турцыі ў Беларусь.
- **Сезон сельгаскірмашоў у Мінску працягнулі да 5 снежня.**
- Сумныя навіны з Расіі: памерлі акадэмік РАН кардыёлаг Яўген Чазаў і пісьменнік-сатырык Віктар Каклюшкін.
- **У Магілёўскай вобласці сёлета ад узгарання знішчана 40 аўтамабіляў.**
- У Латвіі будаўнікі без ковід-сертыфікатаў не будуць дапускацца да работы з 15 снежня.

ISSN 1990 — 763X

Рынак працы

# ПОПЫТ НА БУХГАЛТАРАЎ, ІНЖЫНЕРАЎ І МЕДЫКАЎ

**У Віцебскай вобласці ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя застаўся на леташнім — каля 0,3 %. На ўліку каля 1,2 тысячы чалавек. Дарэчы, гэта на чатырыста меней, чым год таму. Паводле інфармацыі Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Віцебскай вобласці, у эканоміцы занята парадку 472,4 тысячы чалавек. Назваць тых, хто не ў гэтым спісе, лішнімі язык не паварочваецца, бо традыцыйна вакансій у некалькі разоў больш, чым беспрацоўных.**

Па інфармацыі на 1 кастрычніка колькасць апошніх знізілася ў дзевятнаццаці раёнах вобласці з 21-го, тое самае — у гарадах Віцебску і Наваполацку, не змянілася — у Бешанковіцкім раёне, павялічылася — у Шумілінскім.

У рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Рынак працы і садзейнічанне занятасці» на 2021—2025 гады ў студзені-верасні 12,7 тысячы чалавек працаўладкавана, 83 беспрацоўных атрымалі субсідыю для арганізацыі ўласнай справы, больш за 2,5 тысячы чалавек прыняло ўдзел у аплатных грамадскіх працах. Была арганізавана адаптацыя да працоўнай дзейнасці сарака інвалідаў. Каля трыццаці сем'яў беспрацоўных перасялілі на новае месца жыхарства і працы.

У вольны ад вучобы час працавалі каля чатырох тысяч хлопцаў і дзяўчат. Амаль 380 чалавек былі накіраваны на навучанне па запатрабаваных прафесіях. Сярод апошніх: швачка, кіроўца аўтамабіля, кантралёр-касір, кухар, прадавец, цясляр, слесар-рамонтнік, слесар па рамонце аўтамабіляў, электрагазазваршчык.

**СТАР. 4**

З першых вуснаў

# «Следчы камітэт павінен быў стаць магутным органам, які займаецца расследаваннем усіх крымінальных спраў»

## Прэзідэнт Беларусі прыняў з дакладам старшыню Следчага камітэта Дзмітрыя Гару

**Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сваю пасаду Дзмітрый Гара заняў сёлета ў сакавіку. Але з-за напружанасці бягучых падзей можна лічыць адзін год яго службы за тры, асабліва ў той сітуацыі, што знаходзілася краіна ў мінулым годзе, сцвярджае Прэзідэнт.**

«Знаходзімся ў няпростай сітуацыі і ў гэтым годзе. Усе мінулыя беды і праблемы зваліліся на вашы плечы і плечы вашых калег», — кажа кіраўнік краіны.

Па яго словах, новаму старшыні Следкама засталося шмат спраў, якія неабходна было разгледзець. Таму першае пытанне ад Прэзідэнта — ці ўдалося з імі справіцца? Другое — пра патрыятызм і адданасць народу, закону, калектыву Следчага камітэта.

«У праваахоўных органах вы чалавек не новы. Тады я казаў, што вы спакойна можаце хутка разабрацца ў сітуацыі, арганізаваць нармальную работу Следчага камітэта і працягнеце добрыя традыцыі, якія былі закладзены пры папярэдніх кіраўніках Следчага камітэта», — дадае Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што пры дакладзе неабходна звярнуць увагу на рабоце на перспектыву: «Калі вы бачыце, што неабходна мая дапамога і падтрымка, вы скажыце, я буду гэта рабіць».

Па словах Прэзідэнта, дзесяць гадоў (менавіта столькі існуе Следчы камітэт Беларусі) для такога ведамства — невялікі тэрмін. «Мы паўмерамі не абмяжоўваліся, як у некаторых нашых постсавецкіх рэспубліках. Перадалі Следчаму камітэту практычна ўсе паўнамоцтвы. За КДБ засталося некалькі следчых, што займаюцца спецыфічнымі праблемамі, звязанымі са шпіянажам і нейкімі спецыфічнымі для спецслужбы пытаннямі. Як і мелася на ўвазе, Следчы камітэт павінен быў стаць магутным органам, які займаецца расследаваннем усіх крымінальных спраў», — расказвае Прэзідэнт.

Рэзюмуючы тэму, ён пытаецца, ці склалася такая практыка за дзесяцігоддзе і што яшчэ для гэтага неабходна зрабіць.

Свой даклад Дзмітрый Гара пачаў з заўвагі, што сёння Следчы камітэт гатовы да выканання любых задач у рамках закона, інтарэсаў дзяржавы.

«Не будзе ніякіх хістанняў, ніякага сумневу. Мы будзем рабіць усё для дабрабыту дзяржавы. Людзі да гэтага гатовы. Я кажу гэта сёння з поўнай упэўненасцю», — рапартуе старшыня ведамства.

Марыя ДАДАЛКА.

### Каментарый у тэму

Дзмітрый Гара, старшыня Следчага камітэта, расказаў журналістам пасля сустрэчы з Прэзідэнтам, што шмат увагі на ёй удзялілі пытанню кіберзлачынства.

«Гэта тэма, якая хвалюе сёння і грамадства, і кіраўніка краны. Было далажана пра тыя меры, што прымае Следчы камітэт для зніжэння ўзроўню злачынства ў сферы высокіх тэхналогій, інтэрнэце. Сёння мы бачым, што фактычна чвэрць злачынстваў у вытворчасці Следкама — гэта крадзяжы шляхам мадыфікацыі камп'ютарнай інфармацыі», — паведамляе Дзмітрый Гара.

Яшчэ адзін кірунак дзейнасці ведамства, па словах яго кіраўніка, — барацьба з экстрэмізмам. «Расследаванне спраў экстрэмісцкай накіраванасці ідзе планамерна, сістэматызавана. Больш акцэнт — аналітыцы. Мы бачым працэсы, якія не заўважалі яшчэ год, паўгода таму. Мы збіраем даныя і выходзім на больш буйныя і дэталёвыя схемы. Ёсць паток крымінальных спраў, што ўзбуджаюцца амаль штодзённа ў адносінах асоб, якія прымалі ўдзел у масавых беспарадках», — адзначае Дзмітрый Гара і дадае, што гэтую работу будуць працягваць, і канца ёй не відаць.

Прымае ўдзел Следчы камітэт сумесна з Генеральнай пракуратурай у расследаванні крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа. Следкам праводзіць допыты, вывучае архіўныя матэрыялы. Па словах кіраўніка ведамства, толькі адных допытаў па гэтай справе праведзена ўжо каля 11 тысяч. Дзмітрый Гара паведаміў, што абмяркоўваецца пытанне аб стварэнні міждзяржаўнай групы з прадстаўнікамі Следкама Расіі для расследавання генацыду ў часы Вялікай Айчыннай вайны.

---

Кантэкст

# «ЛЮДЗЕЙ БІЛІ ПРЫКЛАДАМ, НАГАМІ ПА РЭБРАХ, ТОКАМ У ШЫЮ»

## Працягваюцца зверствы і правакацыі на граніцы

**Сітуацыя на беларуска-польскай граніцы застаецца напружанай, паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. «Каля польскай загароды прадаўжаюць знаходзіцца бежанцы, у тым ліку жанчыны і дзеці, — адзначылі ў ДПК. — Лагер перыядычна папаўняецца новымі групамі людзей, якія прыбываюць. З-за доўгага знаходжання ва ўмовах паніжаных тэмператур бежанцы часцей звяртаюцца па аказанне медыцынскай дапамогі. Паблізу лагера кругласутачна дзяжураць медыцынскія брыгады». Па меры магчымасці ў лагер дастаўляецца гуманітарная дапамога грамадскімі арганізацыямі і валанцёрамі. «Польскія ваеннаслужачыя прадаўжаюць аказваць псіхалагічнае ўздзеянне на бежанцаў, выкарыстоўваюць гучнагаварыцелі, пражэктары і страбаскопы, а таксама ігнаруюць просьбы аказаць дапамогу людзям, якія знаходзяцца на польскай тэрыторыі непасрэдна каля польскай загароды», — дадалі ў ведамстве.**

Мінабароны Польшчы працягвае публікаваць правакацыйныя паведамленні і суправаджае іх загадзя лжывай інфармацыяй. Аб гэтым паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. «У рэчаіснасці група бежанцаў са стыхійнага лагера, у тым ліку жанчыны і дзеці, ушчыльную падышла да польскіх загарод на польскай тэрыторыі, каб чарговы раз звярнуцца па атрыманне аховы ў Польшчы. Праз пэўны час аднаму з мужчын стала дрэнна. Аднак польскі бок замест аказання дапамогі, аб якой прасілі жанчыны і дзеці, працягваў абыякава асвятляць групу бежанцаў страбаскопамі і здымаць тое, што адбываецца, на камеру», — распавялі ў ДПК.

На месца прыбылі беларускія вайскоўцы, якія неаднаразова прасілі людзей вярнуцца ў Беларусь. Паколькі тэрыторыя непасрэдна каля загароды з'яўляецца польскай, падысці да мужчыны для аказання першай дапамогі без парушэння граніцы было немагчыма. «Падобныя публічныя інфармацыйныя ўкідванні польскага боку з'яўляюцца спробамі дыскрэдытацыі беларускіх вайскоўцаў. Як відаць, цяпер усе намаганні польскага боку накіраваны не на вырашэнне праблемы міграцыйнага крызісу на мяжы ЕС, а на актыўнае распаўсюджванне дэзынфармацыі, — заўважылі ў Дзяржпагранкамітэце. — Пры гэтым Польшча працягвае непрыкрыта дэманстраваць беспакаранасць сваіх дзеянняў, якія яўна парушаюць нормы міжнароднага права».

Між тым бежанцы знаходзяцца ў экстрэмальных умовах. «Вельмі холадна. Асабліва ноччу. Гэта няпростае выпрабаванне і для дарослых, а пра дзяцей і гаварыць няма чаго», — распавёў карэспандэнту БелТА адзін з бежанцаў, якога завуць Калед. Яму 48 гадоў. Ён родам з прыгарада Дамаска. Кажа, што на радзіме складана. Усе дзеці жывуць у Нідэрландах. Ён ідзе да іх і не разумее, чаму яго не прапускаюць. «Я ў Польшчу не хачу. Я хачу да дзяцей», — паўтарае мужчына і задае пытанне журналістам, калі прывязуць ежу. Дастаўкі гуманітарнай дапамогі праходзяць рэгулярна, але бежанцы гавораць, што прадуктаў ім пакуль не хапае. Скардзіцца на складаныя ўмовы і малады сірыец. Ён кажа, што ўжо сутыкнуўся з жорсткасцю польскіх сілавікоў, але спроб трапіць да сям'і ў Германію не пакідае. Мужчына спадзяецца на хуткае вырашэнне крызісу. Дарэчы, у лагеры цяпер, паводле розных ацэнак, больш за 3 тысячы чалавек. Каля 500 з іх дзеці, некаторыя — немаўляты.

Саветнік па гуманітарных пытаннях міжнароднай арганізацыі «Урачы без межаў» (MSF) Кайл МакНэлі расказаў аб зверствах, якія ўчыняюцца польскімі і літоўскімі пагранічнікамі ў адносінах да бежанцаў, паведамляе брытанская газета The Guardian. «Сітуацыя адчайная, і яна пагаршаецца», — сказаў Кайл МакНэлі. Паводле слоў саветніка MSF, ён «на свае вочы бачыў траўмы, атрыманыя людзьмі ў выніку нападзення пагранічнікаў з Польшчы і Літвы». «Людзі расказвалі, што іх білі прыкладам пісталета, білі нагамі па рэбрах, білі токам у шыю, а ўсе іх рэчы адабралі або знішчылі еўрапейскія пагранічнікі. Гэта непрымальна і павінна спыніцца цяпер жа», — заклікаў Кайл МакНэлі.

Гуманітарны крызіс на граніцы пагаршаецца, а разам з ім расце варожасць польскай паліцыі і ваенных, расказваюць карэспандэнты The Guardian, якія пабылі на месцы падзей. На граніцы з мэтай дэманстрацыі сілы знаходзяцца амаль 20 тысяч польскіх пагранічнікаў і ваеннаслужачых. З калонак на граніцы з боку Польшчы гучыць закальцаваны запіс: «Увага! Увага! Перасячэнне польскай граніцы дазволена толькі ў прапускных пунктах». Гэта злавеснае папярэджанне адрасавана тысячам прасіцеляў прыстанішча, якія сабраліся на іншы бок калючага дроту, што праходзіць паміж Польшчай і Беларуссю.

Бежанцы, якім удаецца прайсці на польскую тэрыторыю, жорстка выцясняюцца пагранічнікамі. Праўда, некаторым усё ж удаецца дабрацца да Варшавы, схаваўшыся ў густых лясах. Карэспандэнты The Guardian сустрэлі групу з трох курдскіх сем'яў з іракскага Дахука. Сярод іх было не менш за восем дзяцей. Людзі расказалі, што ім давялося пакінуць сваю краіну з-за страху адплаты з боку былых членаў тэрарыстычнай арганізацыі ІД. Гэтыя сем'і ўжо дзевяць разоў спрабавалі перасекчы граніцу, але кожны раз іх лавілі і выштурхоўвалі назад.

Паводле даных MSF, адна сірыйская сям'я правяла ў лесе на польскім баку граніцы 21 дзень, перш чым яе прымусілі вярнуцца. Адзіная, хто спрабаваў дапамагчы гэтым людзям, — мясцовыя жыхары, якія рызыкавалі ўласнай бяспекай, спрабуючы выратаваць бежанцаў.

На фоне гэтага ўрад Польшчы спрабуе стварыць негатыўны вобраз бежанцаў. Так, у пачатку кастрычніка польскія ўлады выступалі ў прэсе з заявамі, што бежанцы паводзяць сябе дзіўна і, магчыма, знаходзяцца пад наркатычным уздзеяннем. Прадстаўнік фонду «Выратаванне» і каардынатар Цэнтра дапамогі іншаземцам у Варшаве Ганна Хмялеўская лічыць такія заявы фэйкам. «У нас няма інфармацыі аб такіх гісторыях, і для мяне гэта гучыць як фэйкавыя навіны, з-за якіх бежанцы выглядаюць небяспечнымі, а Беларусь — дрэннай», — адзначыла Ганна Хмялеўская.

Абуранае міжнародная рэакцыя на падзеі на граніцы. У Міністэрстве замежных спраў Беларусі пракаментавалі правядзенне закрытых кансультацый Савета Бяспекі ААН па пытанні бежанцаў на заходніх межах Беларусі. Адпаведны каментарый прэс-сакратара МЗС Анатоля Глаза апублікаваны на сайце знешнепалітычнага ведамства. Як вядома, напярэдадні па ініцыятыве Францыі, Эстоніі і Ірландыі прайшлі закрытыя кансультацыі членаў Савета Бяспекі ААН па пункце парадку дня «Іншыя пытанні» адносна сітуацыі вакол вялікай колькасці бежанцаў каля заходніх граніц Беларусі. Як заявілі ў МЗС, «сэнс гэтага штучна зрэжысіраванага мерапрыемства складаўся менавіта ў тым, каб чарговы раз стварыць інфармацыйную нагоду для беспадстаўных абвінавачанняў у адрас Беларусі».

«Гэта стары гебельсаўскі прапагандысцкі прыём: калі паўтараць хлусню тысячу разоў, то ў яе павераць. На жаль, мы сёння знаходзімся ў тэатры абсурду. Краіны Еўрасаюза, магутнага блока НАТА, спрабуюць сыграць танную п'еску аб тым, што нібыта ад адносна невялікай і надзвычай талерантнай Беларусі зыходзіць пагроза свету, і выстаўляюць яе агрэсарам. Па зразумелых матывах спрабуюць сказіць і загаварыць відавочны факт: першапрычына глабальнага міграцыйнага крызісу складаецца ў незаконным умяшанні краін Захаду ва ўнутраныя справы іншых, арганізацыі ваенных інтэрвенцый і разбурэнні імі цэлага шэрагу дзяржаў. Беларусь у гэтай сітуацыі — толькі краіна транзіту, якая, дарэчы, нясе істотныя выдаткі», — звярнуў увагу Анатоль Глаз. У МЗС адзначылі, што ў мінулым годзе ЕС прыняў паўмільёна новых бежанцаў і ніхто асабліва не заўважыў якіх-небудзь палітычных наступстваў. «А дзве-тры тысячы бежанцаў, якія імкнуцца трапіць праз Беларусь у Еўропу, якая іх запрасіла, — гэта ўжо, бачце, «гібрыдная вайна». Абсалютна зразумела: напружанне на граніцы Беларусі з Еўрасаюзам звязана не столькі з рэальнымі праблемамі, якія могуць стварыць тры тысячы мігрантаў, колькі з тым, што Польшчы, Літве, Латвіі выгадна раздзімаць гэты крызіс. Асабліва Польшчы», — заявіў прэс-сакратар.

«Таму кансультацыі, як я ўжо сказаў, чакана насілі поўнасцю зрэжысіраваны характар. І самае важнае, што ніхто з іншых членаў Савета Бяспекі за межамі заходняй групы не падтрымаў ініцыятараў і не выступіў з крытыкай нашай краіны. Наадварот, дзяржавамі зусім лагічна ставілася пытанне аб неабходнасці комплексна глядзець на праблему, змагацца з першапрычынамі міграцыйнага крызісу, весці прамы дыялог паміж краінамі паходжання, транзіту і канчатковага прытрымлівання. Калі ж гэтае мерапрыемства будзе выкарыстана Еўрасаюзам у якасці дадатковага аргумента для ўвядзення чарговага пакета санкцый, то хачу сказаць, што Мінск гатовы на самыя жорсткія меры ў адказ», — папярэдзілі ў МЗС.

Пётр ДУНЬКО.

# ЛЮДЗІ ЎСІХ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЯЎ І ВЕРАВЫЗНАННЯЎ ЖАДАЮЦЬ ЖЫЦЬ ПАД МІРНЫМ НЕБАМ І БАЧЫЦЬ УСМЕШКІ НА ТВАРАХ ДЗЯЦЕЙ

**Кіраўнікі вядучых канфесій Рэспублікі Беларусь прынялі зварот да палітыкаў еўрапейскіх дзяржаў і вернікаў у сувязі з міграцыйным крызісам на беларуска-польскай граніцы.**

Подпісы пад дакументам паставілі Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, арцыбіскуп Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Рымска-каталіцкай царквы Іосіф Станеўскі, муфцій Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Абу-Бекір Шабановіч, галоўны рабін Рэлігійнага аб'яднання абшчын прагрэсіўнага іудаізму Рыгор Абрамовіч.

«Трагічныя падзеі, звязаныя з міграцыйным крызісам, якія адбываюцца цяпер на міралюбівай і шматпакутнай беларускай зямлі, чалавечае гора і боль тысяч людзей, якія замярзаюць на межах нашых дзяржаў, заахвоцілі нас звярнуцца да вас, — гаворыцца ў дакуменце. — Асноўныя сусветныя рэлігіі прапаведуюць любоў да бліжняга свайго і заклікаюць да міласэрнасці, дабра і спачування: Слова Божае кажа нам аб тым, што вандроўнікі мы перад Ім і «прышэльцы, як і ўсе бацькі нашыя, як цень дні нашыя на зямлі і няма нічога трывалага».

«Мы, кіраўнікі вядучых канфесій Рэспублікі Беларусь, звяртаемся да палітыкаў сучасных эканамічна развітых і паспяховых еўрапейскіх дзяржаў. Не віна гэтых людзей, што яны, пакінуўшы свае родныя землі, дзе ідуць ваенныя дзеянні, шукаюць лепшага лёсу для сябе і сваіх дзяцей. Не віна іх у тым, што ад безвыходнасці і страху яны, пераадольваючы тысячы кіламетраў, разнастайныя цяжкасці і пазбаўленні, змушаныя шукаць прытулак у іншых краінах. Шлях да сваёй лепшай будучыні ў Еўропе гэтыя людзі шукаюць праз Беларусь. Людзі ўсіх нацыянальнасцяў і веравызнанняў жадаюць жыць пад мірным небам і бачыць усмешкі на тварах дзяцей», — гаворыцца ў звароце.

У дакуменце адзначаецца: «Зусім хутка хрысціянскі свет запяе славу Хрысту, які нарадзіўся. Многія дамы будуць упрыгожаны да Божага Нараджэння, сімвалізуючы жаданне прыняць народжанага Бога ў сваім сэрцы. Чакаючы літасці і цудаў Божых у сваім жыцці, пераймаючы Творцу, мы можам утварыць цуд самі. Гэты перыяд адыходзячага года ва ўсіх традыцыйных рэлігіях вернікі больш актыўна робяць справы дабрачыннасці, міласэрнасці і дапамогі тым, хто жыве ў нястачы, прысвячаючы іх Богу, што ў гэтым годзе мы паднясём у дар Богу? Бо ў кожнага бежанца, які чакае вырашэння свайго лёсу на еўрапейскай мяжы, ёсць свая асабістая трагедыя. Іх слёзы, якія праліліся ад болю на роднай зямлі, працягваюць праліваюцца».

«Кожны чалавек, створаны па вобразу і падабенстве Божым, мае права быць пачутым і зразуметым, жыць у міры, быць упэўненым у сваім заўтрашнім дні і будучыні сваіх дзяцей, — адзначылі кіраўнікі канфесій Беларусі. — У чаканні Раства Хрыстова і Новага года заклікаем палітыкаў, усіх вернікаў і проста неабыякавых людзей Еўропы да мудрасці, міласэрнасці і спагады, да выратавання людзей, якія знаходзяцца без прытулку, у стане роспачы. Мы ўсе заклікаемся Словам Божым да найхутчэйшага вырашэння сітуацыі, якая склалася, — даць ім не толькі надзею і параду, але і неабходную дапамогу і магчымасць рэалізаваць свае спадзяванні».

«Сёння мы павінны задумацца: а што чакае нас у недалёкай перспектыве? Што будзе заўтра? Бо кожнаму з нас належыць даць адказ перад Госпадам за свае дзеі, бо на зямлі мы толькі прышэльцы і падарожнікі. Хай будзе з усімі намі мір і Божае благаслаўленне!» — гаворыцца ў звароце кіраўнікоў вядучых канфесій Рэспублікі Беларусь.

# ЦЁПЛЫЯ РЭЧЫ

**Учора на беларуска-польскую граніцу адправілі некалькі машын з гуманітарнай дапамогай. Груз сфарміраваны ў адпаведнасці з патрэбнасцямі людзей, якія апынуліся ў складанай сітуацыі без ежы, вады і прытулку, паведамляе БелТА.**



Гуманітарную дапамогу сабралі ў тым ліку дзякуючы неабыякавым грамадзянам, прадпрыемствам, розным грамадскім арганізацыям.

«На гэты момант з гуманітарным грузам на граніцу адправілася шэсць машын. У іх — коўдры, цёплыя рэчы і абутак, прадукты харчавання ды сродкі гігіены, вада», — расказаў **генеральны сакратар камітэта Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый ШАЎЦОЎ.**

Паводле яго слоў, разглядаецца магчымасць арганізацыі пункта часовага захоўвання рэчаў у Гродне.

Таксама ў складзе групы адправіўся перакладчык, каб удакладніць патрэбы людзей для далейшага збору дапамогі. Гэта цэлыя сем'і, нярэдка з маленькімі дзецьмі. Каб падтрымаць іх, ужо зараз арганізаваны збор рэчаў у абласных і раённых арганізацыях Беларускага Чырвонага Крыжа. Усе неабыякавыя могуць прынесць коўдры, шапкі, рукавіцы, шалікі, тэрмакоўдры, гімнастычныя дыванкі, дажджавікі, цёплае дзіцячае адзенне і абутак, у тым ліку зімовы. Усе рэчы павінны быць у здавальняльным стане.

Акрамя таго, кожны, хто хоча дапамагчы, можа зрабіць дабрачынны плацеж. Зрабіць гэта можна ў сістэме АРІП праз пункт "Дабрачыннасць, грамадскія аб'яднанні", далей «Дапамога дзецям, дарослым» — «Беларускі Чырвоны Крыж» — «Дабрачынныя ўзносы» — «Сакратарыят Чырвонага Крыжа» — «Дабрачынны ўзнос». Затым увесці нумар дабрачыннай акцыі 9000, даныя і суму плацяжу.

На сабраныя сродкі Чырвоны Крыж набывае і будзе дастаўляць бежанцам, якія маюць у гэтым патрэбу, прадукты ды сродкі гігіены, лекі, цёплае адзенне і абутак, дапаможа аплаціць паслугі іх часовага пражывання і задаволіць іншыя патрэбнасці па запыце.

У пятніцу на дзясятцы машын у лагер бежанцаў на граніцы даставілі больш за 10 тон прадуктаў і прадметаў першай неабходнасці. Сярод іх — хлеб, мясныя кансервы, кандытарскія вырабы, малако, сродкі гігіены, у тым ліку для дзяцей і жанчын, а таксама цёплыя рэчы.

У фарміраванні партыі гуманітарнай дапамогі прынялі ўдзел Беларускі Чырвоны Крыж, арганізацыі і прадпрыемствы, грамадскія і палітычныя аб'яднанні.

Таксама на рэгулярнай аснове ў лагер падвозіцца пітная вада. Дастаўляюцца бежанцам сухія дровы. Самі яны ўладкоўваюць лагер.

Дзяжураць тут і медыкі, гатовыя пры неабходнасці аказаць неадкладную дапамогу.

**Магілёўская** абласная арганізацыя Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа плануе суботняй раніцай адправіць машыну з гуманітарным грузам для бежанцаў у Гродна. Актыўны ўдзел у зборы дапамогі ўзялі прадпрыемствы Магілёва: «Дамачай», «Бабулін гладыш», «Магілёўліфтмаш» і іншыя, а таксама жыхары абласнога цэнтра. Днямі збор гуманітарнай дапамогі для бежанцаў будзе арганізаваны і ў раёнах Магілёўскай вобласці. Дапамагчы зможа кожны ахвотны.

Дапамога ад **Гомельскай вобласці**, адрасаваная бежанцам на беларуска-польскай граніцы, у складзе гуманітарнага канвою накіравана ў стыхійны лагер.

Груз сфарміраваны Гомельскай абласной арганізацыяй Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа сумесна з абласной арганізацыяй ГА «Беларускі саюз жанчын», Гомельскай епархіяй Беларускай праваслаўнай царквы. Для аказання дапамогі сабралі прадукты харчавання, адзенне і абутак, гігіенічныя прылады, коўдры. Неабходныя рэчы для фарміравання гуманітарнага грузу ў тым ліку ахвяраваны жыхарамі Гомельшчыны. Сярод тых, хто прыняў актыўны ўдзел у зборы дапамогі, — таксама валанцёры абласной арганізацыі Чырвонага Крыжа, якія набывалі неабходнае для бежанцаў за ўласныя сродкі.

— Мы палічылі сваім абавязкам дапамагчы людзям, якія зараз знаходзяцца на граніцы з Польшчай. На Гомельшчыне добра разумеюць, што нельга пакідаць гэтую няпростую сітуацыю без увагі, — адзначыла **старшыня абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, член Савета Рэспублікі Ала СМАЛЯК.** — Мы ў свой час сутыкаліся з сітуацыяй, калі на памежжы знаходзіліся паломнікі-хасіды, аказвалі ім разнапланавую дапамогу. Цяпер мы разумеем, што гэтыя марозныя ночы асабліва складана перанесці маленькім дзецям, жанчынам. Спадзяюся, што сітуацыя хутка вырашыцца. Не павінны пакутаваць у мірны час людзі.

Па словах **старшыні Гомельскай абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын» Алены КЛІЧКОЎСКАЙ**, раённыя арганізацыі аператыўна падключыліся да акцыі па зборы сродкаў, каб дапамагчы людзям, якія праводзяць на граніцы з Польшчай ужо не першую ноч у холадзе.

— Мы, жанчыны Гомельшчыны, абураныя той сітуацыяй, якая адбываецца. Вельмі перажываем за цяжарных жанчын, за дзяцей і ўвогуле за ўсіх людзей, якія знаходзяцца ў стыхійным лагеры. Мы асуджаем тыя дзеянні Еўропы, калі не выконваюцца абавязкі, каб даць роўныя правы бежанцам, — выказала пазіцыю Алена Клічкоўская.

Прынамсі, на Гомельшчыне гатовыя арганізаваць яшчэ адзін гуманітарны груз, які паступова фарміруецца, можа быць дастаўлены на наступным тыдні. Але валанцёры спадзяюцца, што крызіс на граніцы ў хуткім часе вырашыцца, і аказваць дапамогу людзям у стыхійным лагеры больш не будзе неабходнасці.

Валанцёрамі **Гродзенскай** абласной арганізацыі Чырвонага Крыжа апошнімі днямі двойчы накіроўвалася дапамога для бежанцаў. Людзям былі перададзены прадуктовыя наборы, у складзе якіх каўбасныя, хлеба-булачныя, кандытарскія вырабы, мясныя кансервы, садавіна, бутыляваная вада. Таксама ў склад гуманітарнага груза ўвайшлі гігіенічныя наборы, цёплая вопратка, шкарпэткі, коўдры. Агульная вага дапамогі склала больш за 7 тон.

Дапамога аказвалася ва ўзаемадзеянні з прадстаўнікамі беларускага парламента, Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, прадпрыемстваў харчовай і лёгкай прамысловасці, а таксама прадстаўнікамі Міжнароднай федэрацыі таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца ды іншых структур. Да акцыі далучыліся прадпрыемствы «Гроднамясамалпрама», «Гроднахлебапрама».

Гродзенскае аддзяленне Беларускага Чырвонага Крыжа працягвае збор рэчаў, у якіх маюць патрэбу бежанцы.

Да акцыі падключылася і Гродзенская абласная арганізацыя БРСМ. З іх боку валанцёрамі перададзена каля 200 прадуктовых пакетаў. Яны сфарміраваны пры дапамозе нераўнадушных людзей. Асаблівы клопат аб дзецях. Для іх сабралі садавіну, сокі, малако, дзіцячае харчаванне. У абласным камітэце БРСМ паведамілі, што і надалей будзе працягнуты збор дапамогі — прадуктаў, цёплага адзення, сродкаў гігіены, іншых неабходных рэчаў. Груз па меры фарміравання адразу будзе накіроўвацца ў лагер бежанцаў.

Як паведамілі ў **Брэсцкай** гарадской арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, тут збіраюцца наладзіць збор цёплых рэчаў для бежанцаў. Спецыяліст гарадской арганізацыі Алёна Саевіч сказала, што гараджане тэлефануюць да іх, цікавяцца, чым можна дапамагчы бежанцам. Пакуль прынята рашэнне пачаць збор цёплых рэчаў. Курткі, паліто, пухавікі, коўдры ахвотныя могуць прынесці ў гарадскую арганізацыю на адрас: Арлоўская, 28 альбо ў абласную на Пушкінскую,19.

У **Віцебскую** гарадскую арганізацыю Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа прыносяць адзенне для тых, хто апынуўся ў цяжкім становішчы на граніцы. Як удакладнілі карэспандэнту «Звязды» ў арганізацыі, ахвяравалі некалькіх жаночых і мужчынскіх куртак. У суботу можна будзе прадоўжыць перадачу цёплага адзення.

Акрамя рэчаў тут прымаюць сродкі гігіены. Можна дапамагчы грашыма, калі перавесці іх на рахунак дабрачыннай арганізацыі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### Тым часам

Спартыўна-аздараўленчы цэнтр «Світанак» у Гродзенскім раёне пачаў падрыхтоўку да магчымага прыёму дзяцей бежанцаў з лагера каля беларуска-польскай граніцы, паведаміў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ПРАНЮК.** «Аб'ект цяпер свабодны. Тут у цяпле могуць размясціцца да 200 чалавек. Пры неабходнасці будзе забяспечана і медыцынская дапамога», — сказаў ён.

# ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ СВЯТОЙ АБІЦЕЛІ

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла рабочую нараду па пытаннях рамонтна-рэстаўрацыйных работ у Свята-Успенскім мужчынскім манастыры ў Жыровічах.**

Наталля Качанава падкрэсліла, што яго рэканструкцыя і рамонт вядзецца ў рэчышчы выканання даручэння кіраўніка дзяржавы па прывядзенні ў ідэальны парадак усяго комплексу гістарычных як богаслужбовых, жылых, так і гаспадарчых пабудоў манастыра. Нагадаем, адносна нядаўна Наталля Качанава наведвала Жыровіцкі манастыр. Падчас візіту яна азнаёмілася з ходам рэканструкцыі шэрагу яго аб'ектаў.

На нараду са спікерам верхняй палаты парламента былі запрошаны старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Ліскові, міністр эканомікі Аляксандр Чарвякоў, міністр фінансаў Юрый Селівёрстаў, міністр культуры Анатоль Маркевіч, святары, напрыклад, архіепіскап Навагрудскі і Слонімскі Гурый, іншыя зацікаўленыя асобы.

У ролі асноўнага дакладчыка выступіў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік, які даволі падрабязна распавёў аб стане рамонтна-рэстаўрацыйных работ у Жыровічах. У ходзе абмеркавання парадку дня нарады разгарнулася даволі працяглая і жывая дыскусія, якая датычылася асобных тэхнічных аспектаў правядзення рэстаўрацыі, праходжання экспертызы праекта.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Розныя — роўныя

# Зрабіць асяроддзе даступным

**Каля 1,5 тысячы беларусаў штогод атрымліваюць інваліднасць па прычыне страты зроку. Увогуле, у стагоддзе камп'ютарызацыі колькасць такіх людзей павялічваецца. 13 лістапада ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень сляпых. Пра магчымасці, створаныя ў нашай краіне для людзей з аслабленым зрокам, расказалі спецыялісты.**

На пачатак гэтага года ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва на ўліку знаходзілася каля 25 тысяч людзей з інваліднасцю па зроку, у тым ліку 1,5 тысячы дзяцей. Для іх, паводле меркавання **старшыні Цэнтральнага праўлення Беларускага таварыства інвалідаў па зроку Алега ШЭПЕЛЯ**, робіцца ўсё магчымае, каб яны адчувалі сябе запатрабаванымі ў грамадстве.

— У нас працуе 18 прадпрыемстваў, якія прымаюць на работу інвалідаў па зроку. Яны размешчаны ва ўсіх абласных цэнтрах і буйных гарадах. Усе іх удалося захаваць, нягледзячы на тое, што ў 90-я многае прадавалася і зачынялася. Адзінокім інвалідам, выпускнікам спецыялізаваных школ мы можам даць і ложка-месца ў інтэрнаце. Напэўна, 99 % такіх людзей працуюць якраз на нашых прадпрыемствах. Такія вытворчасці маюць ільготы, але гэта кампенсацыя нерэнтабельнай працы інвалідаў. У іх 7-гадзінны працоўны дзень, больш працяглы адпачынак. Заработная плата на такіх прадпрыемствах, як правіла, невысокая, аднак з улікам пенсіі, бясплатнай пуцёўкі раз на год, кампенсацыі праезду і камунальных паслуг забеспячэнне інвалідаў па зроку знаходзіцца на нядрэнным узроўні, — аргументуе Алег Шэпель.

На сталічным прадпрыемстве «Святлопрыбор» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку, напрыклад, працуе 1400 чалавек, з іх больш за 800 — інваліды па зроку, у тым ліку сярод іх 150 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Сёння такія людзі могуць атрымліваць самыя розныя прафесіі — ад слесара да масажыста. Апошняя, дарэчы, карыстаецца папулярнасцю ў людзей з дрэнным зрокам. Сумесна з адным са сталічных каледжаў на яго базе рыхтуюць спецыялістаў для IT-сферы. Юрысты, педагогі, дыспетчары таксі — людзям са зніжаным зрокам даступныя многія спецыяльнасці.

Бясплатна і з частковай аплатай інваліды па зроку забяспечваюца тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі — тактыльнымі палкамі, дыктафонамі (плэерамі) для агучвання літаратуры, смартфонамі з адмысловым праграмным забеспячэннем, якое сінтэзуе мову і мае функцыю навігацыі, таномертамі, глюкометрамі і іншым. Напрыклад, за смартфон трэба заплаціць усяго 20 % ад яго кошту, астатняе кампенсуе дзяржава.

У тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання інвалідам па зроку аказваецца шэраг паслуг. У прыватнасці, для інвалідаў першай групы — памочнік у суправаджэнні. За 9 месяцаў бягучага года, паводле слоў кансультанта ўпраўлення па справах інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Евы Зубкоўскай, паслугамі скарысталіся больш за 1300 разоў.

Шмат робіцца і для стварэння ўніверсальнага асяроддзя для інвалідаў — з тактыльнай пліткай, моўнымі і гукавымі інфарматарамі, інфармацыйнымі ўказальнікамі і таблічкамі са шрыфтам Брайля. Да такіх аб'ектаў у сталіцы адносяцца Нацыянальны аэрапорт, чыгуначны вакзал, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. У Брэсце гэта новы аўтавакзал, у Гомелі і Магілеве — новыя палiклiнiкi.

З мая бягучага года зацверджаны новыя нормы ў будаўніцтве. І цяпер усе будынкі, якія ўзводзяцца ці рэканструююцца, мусяць адпавядаць патрабаванням безбар'ернага асяроддзя.

**Алена КРАВЕЦ.**

Бяспека

**Віктар ХРЭНІН:**

# «МЫ ГАТОВЫ АБАРАНІЦЬ РУБЯЖЫ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

**Ваенная актыўнасць, якая развязана нашымі суседзямі каля граніц Беларусі, па сілах, сродках і маштабах ніяк не звязана з міграцыйным крызісам. Аб гэтым заявіў міністр абароны Беларусі Віктар Хрэнін, паведаміла БелТА.**

«На нарадзе Галоўнакамандуючым Узброенымі Сіламі Беларусі была пастаўлена задача на комплекснае прасочванне сітуацыі па перыметры граніцы краіны. У рамках яе выканання мы дэталёва вывучаем абстаноўку на зямлі і ў паветры. Задзейнічаны сілы і сродкі радыётэхнічнай, радыёэлектроннай, радыёлакацыйнай разведкі і шэраг іншых складнікаў для комплекснай ацэнкі і аналізу абстаноўкі», — сказаў Віктар Хрэнін. — Мы адзначаем актывізацыю ваеннай дзейнасці на гродзенскім напрамку. Паблізу дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, на яе заходніх рубяжах, створана групоўка колькасцю звыш 15 тысяч чалавек. Яна ўключае ў сябе падраздзяленні і органы кіравання ад дзвюх брыгад тэрытарыяльнай абароны. Акрамя таго, адзначана разгортванне сіл ды сродкаў і складу 16-й механізаванай дывізіі ПС Польшчы ў раёне населенага пункта Кузніца. Задзейнічаны таксама сродкі ППА, разгорнута групоўка сіл спецыяльных аперацый, падрыхтавана база для нарошчвання групоўкі на дадзеным напрамку. З гэтай мэтай разгорнута 12 палявых лагераў для размяшчэння польскіх ваеннаслужачых і тэхнікі. Таксама адзначана ваенная актыўнасць на беларуска-літоўскім напрамку».

«Узаемадзеянне па лініі разведвальных органаў з Расійскай Федэрацыяй пацвярджае нашы высновы. Ствараецца ўражанне, што нашы суседзі на Захадзе, у прыватнасці Польшча, у рамках вырашэння сваіх унутрыпалітычных праблем, а таксама праблем унутры Еўрасаюза гатовы развязаць канфлікт, у які хочуць уцягнуць Еўропу. У сувязі з гэтым хацелася б перасцерагчы «гарачыя галовы»: не пераацэньваць свае магчымасці. Мова ўльтыматумаў, пагроз і шантажу непрымальная, — падкрэсліў Віктар Хрэнін. — Узброеныя Сілы Беларусі гатовы адказаць жорстка на любыя выпады. Створаная сістэма рэагавання на пагрозы і выклікі дае магчымасць нам гарантаваць бяспеку краіны, у тым ліку пры неабходнасці з нашым галоўным стратэгічным саюзнікам — Расіяй. Мы гатовы абараніць рубяжы Саюзнай дзяржавы і ў самы кароткі тэрмін стварыць неабходную групоўку войскаў на любым напрамку. Спробы запалохаць нас і беспадстаўна абвінавачваць прымушаюць рэагаваць адэкватна на гэтую сітуацыю».

Тым часам стала вядома, што краіны НАТА праводзяць пазапланавыя вучэнні ў Чорным моры, павялічылі інтэнсіўнасць паветранай разведкі каля граніц РФ, паведаміла ТАСС. «Агрэсіўную ваенную актыўнасць ЗША ў Чарнаморскім рэгіёне расцэньваем як пагрозу рэгіянальнай бяспецы і стратэгічнай стабільнасці», — заявілі ў ваенным ведамстве РФ.

**Пётр ДУНЬКО.**

# ПОПЫТ НА БУХГАЛТАРАЎ, ІНЖЫНЕРАЎ І МЕДЫКАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пастаянным попытам карыстаюцца бухгалтары, інжынеры, медыцынскія сёстры, урачы. У сельскай мясцовасці запатрабаваныя трактарысты, аператары машыннага даення, жывёлаводы, ветурачы, заатэхнікі.

Сярод новых магчымасцяў зарабляць — догляд састарэлага чалавека ў замяшчальнай сям'і. У Віцебскай вобласці каля пяцідзесяці замяшчальных сем'яў. Як адзначылі ў Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама, гэта добрая альтэрнатыва стацыянарным формам сацыяльнага абслугоўвання. Яна дазваляе адзінокім пажылым людзям, інвалідам як мага даўжэй пражываць у звыклых хатніх умовах у сем'ях, якія клапоцяцца пра іх.

У замяшчальнай сям'і самотны чалавек атрымлівае неабходныя догляд і клопат. Памочнік, дарэчы, можа працаваць або вучыцца, аднак не ў шкоду клопату аб падапечным. У дваццаці замяшчальных сем'ях па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў памочніку выплачваецца ўзнагароджанне ў сувязі з ажыццяўленнем догляду адзінокіх інвалідаў I групы, якія страцілі здольнасць самаабслугоўвання.

Аб узроўні заробкаў у Прыдзвінскім краі можна меркаваць па абвестках на сайце абласной газеты «Віцебскія весці», дзе размешчана каля 6 тысяч вакансій, у тым ліку каля 80 — за дзень. Сярод свежых — рабочы рытуальных паслуг у Оршы. Яму таксама плацяць 500—600 рублёў у месяц. А выхавальніку інтэрната полацкага кадэцкага вучылішча — каля 440 рублёў. Мантажнік будаўнічых канструкцый у віцебскім домабудаўнічым камбінаце можа разлічваць на заробак ад 1000 рублёў. У прадпрыемстве «Віцебскжылпраект» кандыдату на пасаду начальніка архітэктурна-будаўнічага аддзела абяцаюць 10 000 рублёў. Нагадаю, у сярэдзіне жніўня аршанскае ТАА «Цыліндэрс-Бел», якое займаецца вытворчасцю бясшвовых стальных балонаў высокага ціску, шукала кіраўніка з веданнем англійскай і чэшскай моў на заробак 6,2 тысячы рублёў у месяц. Аб'ява і цяпер актуальная. Відавочна, што на пасады з высокімі заробкамі цяжка знайсці кандыдатаў, якія адпавядаюць патрабаванням наймальніка.

Яшчэ адно назіранне: імідж Віцебшчыны як рэгіёна, адкуль працоўная сіла ўцякае праз празрыстую з Расіяй мяжу, бадай, перастае адпавядаць рэчаіснасці. Гісторыі пра падманы пры аплаце працы за мяжой, дрэнныя ўмовы работы, пандэмія паўплывалі на змяншэнне колькасці гастарбайтараў. Прайшлі гады, калі адчувалася вострая праблема ў пытанні працаўладкавання ў рэгіёне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У СААЗ распавялі аб новай смяротнай пандэміі



Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) папярэдзіла аб тым, што насельніцтва Зямлі рызыкуе абмяняць адну смяротную пандэмію на іншую. У прыватнасці, у СААЗ адзначылі, што пакуль чалавецтва кінула ўсе сілы на барацьбу з COVID-19, імкліва павялічваецца колькасць хворых на адзёр. Пры гэтым, з-за таго што ўся ўвага звернута зараз на каранавірус, 22 мільёны дзяцей летась прапусцілі ін'екцыі ад адру, і толькі 70 % атрымалі другую дозу. А каб максімальна знешчыць небяспеку гэтай жудаснай хваробы, імунізацыя павінна ахопліваць не менш за 95 %. У СААЗ таксама заявілі, што ўспышкі адру зафіксаваныя ўжо ў 26 краінах свету. На думку кіраўніка дэпартамента імунізацыі арганізацыі Кейта О'Браэна, планавая вакцынацыя ад гэтага захворвання павінна быць узмоцнена.

## Урон прамысловасці Сірыі з пачатку вайны перавысіў $23,5 млрд

Аб гэтым заявіў у інтэрв'ю РІА «Навіны» міністр прамысловасці Сірыі Зіяд Сабаг. Паводле слоў міністра, у большай ступені разбураны прамысловыя аб'екты нафтавай галіны. «Але акрамя гэтага, былі мэтанакіраваныя дзеянні па разбурэнні прамысловых аб'ектаў, арыентаваных на вытворчасць прадуктаў харчавання і лекаў, якія мелі стратэгічнае значэнне і непасрэдна ўплывалі на жыццё грамадзян», — дадаў ён. Зіяд Сабаг адзначыў, што сур'ёзны ўрон нанесены тэкстыльнай прамысловасці і ў першую чаргу ў правінцыі Алепа, дзе практычна поўнасцю разбураны і разрабаваны тэрарыстамі прыватныя і дзяржаўныя фабрыкі. Пры гэтым Сірыя аднавіла больш за палову заводаў і фабрык харчовага сектара, разбураных у ходзе вайны. «Прыватны сектар зноў пабудаваў свае заводы, і многія ўжо працуюць. Уведзены ў эксплуатацыю і новыя прадпрыемствы», — сказаў міністр.

## Хуткасць змянення клімату Зямлі пабіла рэкорд даўнасцю ў 24 тысячы гадоў

Кліматолагі высветлілі, што цяпер клімат на Зямлі змяняецца хутчэй, чым 24 тысячы гадоў таму, падчас апошняга наступлення ледавікоў на Еўразію і Паўночную Амерыку. Вынікі даследавання апублікаваў навуковы часопіс Nature. Навукоўцы даследуюць хуткасць змены клімату Зямлі, каб прадказваць, як планета і яе жывёльны і раслінны свет зменяцца ў найбліжэйшыя стагоддзі. Даследаванні паказваюць, што за апошнія два стагоддзі тэмпература на планеце пачала расці ў дзясяткі і нават сотні разоў хутчэй, чым за апошнія некалькі тысяч гадоў. Таму эксперты асцерагаюцца, што прырода не паспее прыстасавацца да наступстваў антрапагенных змяненняў клімату.

Выпрабавана на сабе

# Ці кожнаму па кішэні жыць на прыродзе?

## Як карэспандэнт «Звязды» спрабавала набыць у арт-вёсцы закінуты дом

**Аб вёсцы Салацці, што ў Гродзенскім раёне, даводзілася чуць неаднойчы. Маўляў, там пасяліліся мастакі і рамеснікі, праводзяць пленэры і аздобілі вёску рознымі інсталяцыямі. І быццам цяпер там амаль няма закінутых дамоў. Каб упэўніцца ў такім феномене, я накіравалася ў гэтую вёску, што знаходзіцца непадалёку ад аграгарадка Парэчча.**

### Частка І. Знаёмства з месцам

Прызнацца, арт-вёска зацікавіла яшчэ з адной нагоды. А ці не набыць там якую старую хату па невялікім кошце і пасяліцца ў гэтым мастацкім асяроддзі? Паціху прывесці яе ў парадак і атрымліваць асалоду ад спакойнага вясковага жыцця сярод маляўнічага наваколля... З такімі думкамі я ехала ў бок вёскі разам са сваімі знаёмымі. Можна дабрацца і цягніком, які ходзіць туды з Гродна некалькі разоў на дзень. Многія месцічы, як аказалася, у асноўным ездзяць альбо на аўтамабілях, альбо на веласіпедах. Да найбліжэйшага аграгарадка Парэчча ўсяго некалькі кіламетраў.

Перш чым агледзець саму вёску, прыгадаліся тыя самыя арт-аб'екты. Сапраўды, раз-пораз каля дарогі на вочы траплялі розныя цікавыя інсталяцыі: можна было ўбачыць вялізную гітару, дзіўную кампазіцыю з зоркай, драўляную галаву з каронай. Як потым растлумачылі, гэта выява князя Вітаўта, якім яго ўявілі мастакі.

Самая высокая канцэнтрацыя арт-аб'ектаў сабрана на полі паблізу мясцовай аграсядзібы. Яе **гаспадар Юрый РЭМША** згадзіўся расказаць пра сваю ўнікальную вёску, бо ён, уласна кажучы, і з'яўляецца арганізатарам такіх пленэраў. Сам ён жыве тут больш за 20 гадоў, а потым і для маці купіў тут дом, калі тая выйшла на пенсію. Кажа, што мастакі, якія сталі прыязджаць да яго ў госці, таксама зацікавіліся гэтай мясцовасцю. А потым некаторыя і самі набывалі тут дамы альбо ўчасткі. Праз некаторы час узнікла ідэя правесці пленэр, але не зусім звычайны, а такі, што дапаможа надаць вёсцы асаблівы акцэнт.

— Многія мастакі пагадзіліся прыняць удзел, — расказаў Юрый Рэмша. — Былі прывезены вялікія катушкі з атамнай станцыі, дзесьці каля трыццаці. Пасля першых двух пленэраў мы многія аб'екты развозілі па акрузе. Такія інсталяцыі ўстаноўлены ў многіх навакольных вёсках. А вось з апошняга пленэра вырашылі пакінуць усё тут, у Салацці. Гэта было дзесьці тры гады таму.

Акрамя электракатушак, у ход пайшло ўсё, што валялася пад нагамі: гарбылі, дошкі, гаршкі... Штосьці трапіла ў музей з хатніх прылад на аграсядзібе. Некалькі катушак яшчэ стаяць непрыстасаваныя. «Спатрэбяцца», — ківае Юрый і вядзе на паляну, якую смела можна назваць музеем пад адкрытым небам.

— Вось гэта рыба-пірання, мясарубка, вежа, нейкае НЛА... — каментуе экспанаты мой субяседнік. — А гэта трактар, праўда дзесьці знік руль, прыйдзецца замяніць, магчыма, са старога аўтамабіля. Але ён на ходу, хоць і колы драўляныя, яго прыкацілі сюды пасля заканчэння работы.



Каля дарогі бачым цэлую кампазіцыю, дзе можна распазнаць Францыска Скарыну з мядзведзем і аленя святога Губерта — ахоўніка Гродна. Ёсць у вёсцы і незвычайны крыж. Па словах гаспадара аграсядзібы, ён асвячоны трыма святарамі — праваслаўным, каталіцкім і грэка-каталіцкім. Маўляў, такі крыж адзіны на ўсю Беларусь. А зроблены ён з дубу, які паваліла маланка на вясковым падворку. Гаспадыня хацела яго распілаваць, але, калі даведалася, што мастакі зробяць з яго крыж, дазволіла забраць дрэва. Праўда, мясцовыя жанчыны аддаюць перавагу сваім старым крыжам, што стаяць у пачатку вёскі, — там збіраюцца і ўпрыгожваюць кветкамі.

Між тым звяртаю ўвагу, што многія экспанаты музея пад адкрытым небам пацямнелі — фарбы выцвілі, штосьці зламалася, быццам яны тут стаяць даўно... Ці не збіраюцца ўдзельнікі пленэраў, якія тут жывуць, іх аднавіць? Напрыклад, дадаць колеру. Сапраўды, штосьці будзе рабіцца. Два аб'екты сёлета адрамантавалі. Напрыклад, Пізанскую вежу апрацоўвалі два разы спецыяльным растворам. Але ў цэлым узнаўляць гэтыя творы наўрад ці будуць. Больш перспектыўным гаспадар аграсядзібы бачыць арганізацыю новага пленэру.

Паступова гутарка пераходзіць на саму вёску. Чаму менавіта сюды перабраўся гараджанін? Аказалася, што былі на прыкмеце і іншыя населеныя пункты, але тут вельмі вабіла прырода — два возеры, лес, цішыня. Праз дарогу працякае невялікая рэчка, на балоце жывуць чаплі, бабры, прылятаюць лебедзі. Вось і выбраў гэтыя мясціны для аграсядзібы, а потым і сам дом пабудаваў. Дарэчы, тут нямала велічных катэджаў. Відаць, многія аблюбавалі гэтую вёску, каб укласці сродкі ў маёмасць. У вёсцы нават ёсць дзве каровы, і на малочныя прадукты ёсць добры попыт.

Цікаўлюся, ці многа ў вёсцы закінутых хат. Па логіцы, яны павінны быць, бо вёска невялікая, няма гандлёвых пунктаў, знаходзіцца паводдаль ад аўтатрас. Сапраўды, пагаджаецца суразмоўца. Калі засяляўся, тут было шмат пустых дамоў, але зараз іх няма. Народу тут не шмат, але амаль усе дамы даглядаюцца альбо самімі месцічамі, альбо нашчадкамі, якія прыязджаюць пастаянна і сочаць за парадкам. Вось і гэтым летам тут купілі дом. Прасілі за яго 10 тысяч еўра, але на якой цане сышліся, мой суразмоўца не ведае. Праўда, прадаваўся ён доўга. Ёсць і яшчэ адзін на продаж.

Гэта зацікавіла. Да яго і накіраваліся мы са сваімі спадарожнікамі. Шукаць доўга не прыйшлося. Дом каля самай дарогі з вялікай расцяжкай аб продажы і нумарам тэлефона.



Вядома, напачатку агледзелі ўсё навокал. Падворак зарос бур'яном, гаспадарчыя пабудовы пакасіліся і чакаюць хіба толькі зносу, сам дом таксама з ліку праблемных. І дах трэба мяняць, і падмурак амаль увесь пасыпаўся... Наогул, патрэбны даволі значныя ўкладанні, каб давесці яго да належнага стану. І ўсё ж вырашыла патэлефанаваць па вызначаным на шыльдзе нумары, пацікавіцца, колькі просяць за яго гаспадары. Жанчына адказала, што дом прадае яе сястра, якая жыве ў Літве, і просіць за яго 10 тысяч умоўных адзінак. А вось у якой канкрэтна валюце — ці то ў доларах ці ў еўра, — не ўдакладніла. Што ж, арт-вёска, па ўсім відаць, становіцца прэстыжным месцам пражывання. Прынамсі такі кошт адназначна не па маёй кішэні. Відаць, з марай аб гэтым маляўнічым наваколлі давядзецца развітацца...

### Частка ІІ. Перспектывы

І ўсё ж на адным Салацці, як кажуць, свет клінам не сышоўся. Ёсць іншыя прыгожыя вёскі, і, магчыма, там мне пашанцуе больш. Галоўнае — атрымаць адпаведную інфармацыю. А дзе яна сабраная, як ні ў мясцовых органах улады? З гэтай мэтай патэлефанавала **старшыні Парэцкага сельвыканкама Андрэю МАЦКЕВІЧУ** і папрасіла расказаць аб тым, якія ёсць механізмы набыцця закінутых дамоў, акрамя перагавораў з непасрэднымі ўласнікамі. Аказалася, што ёсць і іншыя шляхі.

Як паведаміў старшыня сельвыканкама, на тэрыторыі Парэцкага сельскага Савета знаходзіцца 25 вёсак. Многія, як і Салацце, карыстаюцца папулярнасцю з-за прыгожага ландшафту. Таму і попыт на дамы і ўчасткі тут ёсць пастаянна. Увогуле, зараз многіх вабіць менавіта прырода. Гэта часта становіцца важным фактарам пры пакупцы. Некаторыя ў пошуках дома спецыяльна праязджаюць па населеных пунктах, каб ацаніць і ландшафт, і стан дамоў. Пры неабходнасці сельвыканкам дапамагае выйсці на ўладальнікаў закінутых сядзіб.

Купіць дамы можна непасрэдна ў сельвыканкама праз аўкцыён. Размова пра маёмасць, якая перададзена мясцовай уладзе па рашэнні суда. Кошт вызначаецца спецыялістам тэхнічнай інвентарызацыі. Гэта і будзе стартавай цаной, а вось фініш можа быць самы непрадказальны. Калі ёсць адзін заяўнік, дом прадаецца па стартавай цане. Тут галоўнае — сачыць за сітуацыяй і не прапусціць чарговыя таргі.

Трэба сказаць, што рэестры пустых дамоў пастаянна абнаўляюцца. Чарговая база даных павінна быць сфарміравана напрыканцы года. Спецыяльная камісія аб'язджае населеныя пункты і хутары, каб устанавіць такія аб'екты. Калі суд вынесе рашэнне аб перадачы іх на баланс сельсавета, той можа пачаць працэдуру продажу. Як зазначыў Андрэй Мацкевіч, у наступным годзе мяркуецца весці гэту работу больш актыўна, каб даваць другое жыццё закінутым дамам. І апошні час назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да іх скарачэння.

— У гэтым плане заканадаўства пастаянна ўдасканальваецца. І варта яго прымяняць на справе. Мы можам канфіскаваць закінутыя дамы і перадаваць іх тым, хто хоча і можа імі займацца, прывядзе ў парадак. Сапраўдны гаспадар нават аварыйнае жыллё перабудуе і добраўпарадкуе, — упэўнены старшыня сельвыканкама.

Магчыма, працэй набыць участак пад будаўніцтва, але не заўсёды ён ёсць. Як выхад — пакупка старых дамоў. І калі пашанцуе, іх можна набыць даволі танна. Тады яшчэ застануцца сродкі, каб прывесці дом у парадак.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91» (Продавец)**

**Лот № 1:**

**гидравлический автомобильный грузовой специальный кран KATO NK-450S на шасси Mitsubishi K503,**

**регистрационный знак KA4522, заводской / кузов (рама) № CT-45176S / 20678.**

Начальная цена с НДС – 48 438,00 руб. Задаток – 4 843,80 руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Местонахождение лота № 1:** г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17.

**Аукцион состоится 16.12.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

*Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB3012 78029001000000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.*

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **14.12.2021 в 11.00**.

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182



**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91»**

**Лот № 1:**

**помещение транспортного назначения**

**с инв. № 500/D-708117116, 479,5 кв. м, адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 48Б-2.**

Обременение: аренда (информация на сайте ino.by).

Начальная цена с НДС – 231 664,50 бел. руб.

Задаток – 23 166,45 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 02.12.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

*Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB3012 78029001000000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.*

Окончание приема заявлений и задатков – **30.11.2021 в 11.00.**

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182



**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91»**

**Лот № 1:**

**административное помещение**

**с инв. № 500/D-708004811, 39,9 кв. м, адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 7.**

**Изолированное помещение расположено в капитальном строении, которое является памятником историко-культурного наследия.**

Начальная цена с НДС – 220 221,24 бел. руб. Задаток – 22 022,12 бел. руб. Шаг аукциона – 1 %.

**Аукцион состоится 15.12.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

*Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB3012 78029001000000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.*

Окончание приема заявлений и задатков – **13.12.2021 в 11.00.**

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91» (Продавец)**

**Лот № 1: сваебойная установка СП67,** инв. № 60058. Начальная цена с НДС – 22 320,00 руб. Задаток – 4 464,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Лот № 2: сваебойная установка СП67,** инв. № 60060, молот трубчатый СП-76, инв. № 60073. Начальная цена с НДС – 22 320,00 руб. Задаток – 4 464,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Лот № 3: грузовой самосвал КРАЗ 256,** кузов (рама) № 704458. Начальная цена с НДС – 5 928,00 руб. Задаток – 1 185,60 руб. Шаг аукциона – 7 %.

**Лот № 4: грузовой специальный автокран LIEBHERR LTM 1160-5.1,** кузов (рама) W09585200EEL05360. Начальная цена с НДС – 1 983 600,00 руб. Задаток – 198 360,00 руб. Обременения: залог. Шаг аукциона – 1 %.

**Местонахождение лотов №№ 1–4:** г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17.

**Аукцион состоится 26.11.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB3012 78029001000000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **24.11.2021 в 11.00**.

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Спецмонтажстрой № 177 г. Гомель» (продавец) в лице антикризисного управляющего / директора ООО «Правовая Стратегия» Васьковского С.А. извещает о проведении 15 декабря 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 300/С-3928**, общей площадью **1 939,1 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-производственного корпуса. Составные части и принадлежности:** три пристройки, два склада, навес. **Капитальное строение с инв. № 300/С-3933**, общей площадью **95,3 кв. м,** назначение – здание специализированное для металлургического производства и металлообработки, наименование – **здание кузницы. Капитальное строение с инв. № 300/С-3932**, общей площадью **211,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание материального склада. Капитальное строение с инв. № 300/С-3930**, общей площадью **36,2 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **здание проходной. Капитальное строение с инв. № 300/С-3931**, общей площадью **57,8 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад масел и ГСМ. Составные части и принадлежности:** подвал. **Капитальное строение с инв. № 300/С-3929**, общей площадью **3,7 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **здание автозаправки**. **Составные части и принадлежности**: ограждение, калитка, ограждение, ограждение, молниеотвод. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000005001371** общей площадью **1,5449 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 323. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000005008163** общей площадью 0,6469 **га (право аренды). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 323. **А также в состав лота № 1 входят:** емкость подземная (инв. № 1286, 1287, 1289, 1290, 1291, 1291), емкость для хранения ГСМ (Башня Рожновского) (инв. № 139, 127), площадка под башенным краном для хранения мелких материалов (инв. № 1589), смотровая канава СУП (инв. № 1303), ворота входные механические (инв. № 1296), промышленная мачта (инв. № 552), ограждение площадки под башенным краном (инв. № 1593), ограждение (инв. № 1295), ограждение забора инв. номер (инв. № 1281), асфальтобетонное покрытие (2 900,0 кв. м) (инв. № 1297/1), асфальтобетонное покрытие (3 100,0 кв. м) (инв. № 1297), шлагбаум (инв. № 1388), мини АТС в административном здании (инв. № 1337), охранная сигнализация (инв. № 1335), емкость из-под цемента (инв. № 1293), топливная колонка (инв. № 1244), топливная колонка (инв. № 1245), топливная колонка (инв. № 1243), кондиционер LG S12 LHP (инв. № 1379), комплексная трансформаторная подстанция (инв. № 546), трубопровод тепловой сети (инв. № 551), сети канализации (инв. № 550), радиофикация (инв. № 547), сети водопровода (инв. № 549), установленный производственный кабель (телефонные кабеля) (инв. № 1343), кабельные линии электропередач (без учета КТП) (инв. № 546), жалюзи вертикальные тип В (инв. № 68851), жалюзи вертикальные (инв. № 4598), жалюзи вертикальные тип А (инв. № б/н), жалюзи-роллета 1,245 * 1,960 (инв. № б/н), жалюзи вертикальные (инв. № 76006), жалюзи вертикальные тип В (инв. № 79482), жалюзи вертикальные тип В (инв. № 75077) | **1 150 461,86** | 57 523,09 | 57 523,09 |
| 2 | **Подъемно-транспортная машина ПТМ-3** (на базе гусеничного трактора ДТ-75) 1981 года выпуска (инв. № 858) | **14 900,00** | 745,00 | 745,00 |
| 3 | **Генератор ECO РБ-7000RS** (инв. № 13715) | **220,00** | 11,00 | 11,00 |

**Продавец: ОАО «Спецмонтажстрой № 177 г. Гомель»,** 246027, г. Гомель, ул. Барыкина, 323.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (029) 668-76-40,** Татьяна Борисовна – юрисконсульт (правовая информация)**, 8 (044) 513-36-10,** Александр Владимирович – зам. директора (осмотр недвижимости и территории).

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 ноября 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 13 декабря 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить все затраты, связанные с организацией и проведением торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129.

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельстекло» филиал «Гомельский ГОК» (продавец) извещает о проведении 15 декабря 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль – Фольксваген Туарег, рег. № 3976 BI-3,** 3,0 л., легковой универсал, 2008 г.в., тип двигателя – дизель, АКПП, пробег – 835 628 км, VIN WWWGZZZ7LZ8D060761. **Местонахождение:** а/г Круговец-Калинино, Добрушский р-н | **19 680,00** | **984,00** |

**Продавец: ОАО «Гомельстекло» филиал «Гомельский ГОК».**

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 381-95-21 – главный инженер филиала «Гомельский ГОК» Синюта Михаил Андреевич. **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельстекло» филиал «Гомельский ГОК»):** BY67 BAPB 3012 2318 5001 3000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» филиал № 312, БИК BAPBBY2X, УНН 401156963, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 15 ноября 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13 декабря 2021 г. в 16.00.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Подача документов по почте не допускается. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней**. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

## Извещение о проведении 24 ноября 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| |
|---|
| **Предмет торгов № 1** |
| Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 500/U-63596 общей площадью 12 555,8 кв. м (наименование – здание «Административно-бытовых и вспомогательных помещений МАЗ по ул. Машиностроителей»; назначение – здание административно-хозяйственное); инженерные сети (общие затраты); теплотрасса; наружные сети ливневой канализации; наружные сети фекальной канализации, наружные сети водопровода; ограждение АБК АЗ; благоустройство; логотип ЗУБР; система ПТО ПТ 7637; монорельс ПТ 7735; монорельс ПТ 7648; кран подвесной мод. ПТ 6946-03.00.000 (5 шт.); шкаф ШРС 1-26 |
| Местонахождение: г. Минск, пр-т Партизанский, 154А |
| Сведения о земельном участке: площадь – 2,3887 га, кадастровый номер 500000000002009005, назначение – земельный участок для обслуживание незавершенного законсервированного капитального строения |
| Начальная цена: 3 499 447,10 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 349 000,00 бел. руб. |
| **Предмет торгов № 2** |
| Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 700/U-83233 общей площадью 20354,4 кв. м (наименование – здание корпуса № 2; назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения)) |
| Местонахождение: г. Могилев, ул. Крупской, 232 |
| Сведения о земельном участке: площадь – 4,2069 га, кадастровый номер 740100000002005878, назначение – земельный участок для обслуживания незавершенного законсервированного здания корпуса № 2 |
| Начальная цена: 208 800,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 20 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск, тел. (017) 217-98-09.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя – 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **24 ноября 2021 года в 11.00** по адресу: г.Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 15.11.2021 по 22.11.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).**

# ЗАБІВАЛІ ЎСІХ, ХТО ТРАПЛЯЎ НА ШЛЯХУ

## Нацысцкая карная аперацыя «Кармаран» стала апошняй масавай акцыяй бесчалавечнасці фашыстаў у дачыненні не толькі да народных мсціўцаў, але і да мірных жыхароў Беларусі

**Май — чэрвень 1944-га. У лясах Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны дзень і ноч не сціхаюць баі. Тут, у раёне возера Палік, з ворагам змагаюцца і народныя мсціўцы Аршанска-Сенненскай зоны — быццам у пастку іх заманілі сюды гітлераўцы, каб канчаткова расправіцца з «бандытамі», якія на працягу трох гадоў, што ідзе вайна, перашкаджаюць ажыццяўленню захопніцкіх планаў. Усіх, хто знаходзіцца на іх шляху, — пад знішчэнне. Не грэбуюць ні жанчынамі, ні немаглымі старымі, нават дзецьмі...**

Пакуль савецкае камандаванне завяршала падрыхтоўку да беларускай стратэгічнай аперацыі «Баграціён», гітлераўцы ачышчалі прыфрантавую зону, тылавыя раёны, а таксама найважнейшыя камунікацыі ад партызан. Усяго за некалькі дзён да вызвалення праз жорсткія здзекі фашыстаў давялося прайсці тысячам беларусам. Перажыўшы амаль усю акупацыю, многім з іх зусім крыху не хапіла, каб дачакацца пераможных залпаў...

### АСУДЖАНЫЯ НА ГАЛОДНУЮ СМЕРЦЬ

Галоўным адрозненнем аперацыі «Кармаран» ад папярэдніх было тое, што супраць партызан змагаліся не толькі падраздзяленні СС і калабарацыянісцкія фарміраванні. У бой з народнымі мсціўцамі ўступілі ўзброеныя з ног да галавы вайсковыя часці Вермахта. Каб канчаткова расправіцца з партызанамі, была задзейнічана артылерыя, танкі. Атакі ажыццяўляліся нават з неба — сваю чорную справу рабілі нямецкія лётчыкі.

Пасля вайны ўдзельнікі тых жудасных падзей скажуць: такія жорсткія экспедыцыі праціўнік праводзіў упершыню. Прадстаўнік Беларускага штаба партызанскага руху А. Бардадын пісаў, што «партызаны Ушацкай і Бягомльскіх зон перажылі згустак усіх цяжкасцяў, якія могуць сустрэцца ў перыяд ваенных дзеянняў».

Дакументы сведчаць: з 1 да 12 мая праціўнік з напрамку Віцебска ў Лепель перакінуў да трох палкоў пяхоты, 30—35 танкаў, 20 бронемашын, да 1000 здраднікаў. «У Талачыне 7000 немцаў, у Беразіне — да 2500, Маладзечна — Вілейка — Смаргонь — да 9500 чалавек, у раёне Зембіна — да 5000 чалавек, у Браславе, Міёрах, Дрысе, Слабодцы — да 8000, у асноўным латышы, часткова немцы. У Чашніках — да 2000 немцаў».

Аперацыя «Кармаран» ажыццяўлялася практычна на той жа тэрыторыі, што і годам раней аперацыя «Котбус». У склад Барысаўска-Бягомльскай зоны, якая падлягала знішчэнню, уваходзілі цалкам Бягомльскі раён, Плешчаніцкі (за выключэннем самога гарадскога пасёлка), заходняя частка Лепельскага і Халопеніцкага, паўночна-заходняя — Барысаўскага, часткова Смалявіцкі, Лагойскі, Заслаўскі, Радашковіцкі, Ільянскі раёны.




**Помнік на месцы спаленай падчас аперацыі вёскі Дальва.**

Вялікая партызанская зона, праз якую праходзілі найважнейшыя транспартныя камунікацыі (меўся нават аэрадром), уяўляла небяспеку для нямецкай арміі. Акрамя таго, гітлераўцы планавалі вывезці ўсё працаздольнае насельніцтва ў Германію, спустошалі кожны падворак: забіралі ў людзей усё — ад адзінай курыцы да апошняга кавалка хлеба.

«Нямецкія каты забівалі ўсіх, хто трапляў на іх шляху, — успаміналі пасля партызаны. — Працаздольнае насельніцтва адпраўлялі ў Германію. Тых, хто не падыходзіў, — пад расстрэл. Не шкадавалі ні старых, ні малых. Яны забралі ў людзей хлеб, бульбу, жалезныя плугі, чугуны, патэльні. Хлеб, які знайшлі ў ямах і не змаглі вывезці, знішчылі. Немцы забаранілі праводзіць сяўбу. Мірныя грамадзяне былі асуджаны на галодную смерць».

«Уся скаціна і птушка канфіскаваны, — пісалі ў данясеннях у штаб народных мсціўцаў. — У вёсках, якія яшчэ не спалены, асабліва ў найбліжэйшых да лесу, не чуваць нават спеваў пеўняў».

### ПРАМІРГАЛІ «БАГРАЦІЁН»

Амаль 60-тысячнай групоўцы карнікаў супрацьстаяла каля 22 тысяч партызанаў, у тым ліку спецгрупы Беларускага штаба партызанскага руху, Народнага камісарыята дзяржаўнай бяспекі БССР і СССР, ваеннай разведкі, якія дыслакаваліся ў раёнах баявых дзеянняў.

Па-рознаму склаўся лёс партызанскіх фарміраванняў, задзейнічаных у аперацыі «Кармаран». Віцебская брыгада, напрыклад, выйшла з акружэння без адзінага выстралу. У той жа час значная частка партызан з брыгады Лапаціна загінула. У цяжкім становішчы апынулася і брыгада «Граза», якая дыслацыравалася ў Талачынскім раёне. Некалькі разоў яна трапляла



пад артылерыйскі агонь і бамбардзіроўку нямецкай авіяцыі — страты былі вялікія. Тыя, каму пашчасціла выжыць, выходзілі з акружэння дробнымі групамі.

Гэта быў цяжкі месяц для партызан. Нават у пачатку вайны яны не адчувалі такога ціску. І хто ведае, чым усё магло б скончыцца, калі б не пачалася аперацыя «Баграціён». 27 чэрвеня немцы былі вымушаны пакінуць партызанскую зону: на пяты наступала Чырвоная Армія. З улікам таго, што значныя сілы былі кінуты на расправу з партызанамі, аперацыя, якая канчаткова памяняла ход вайны не ў лепшы для іх бок, застала акупантаў знянацку. Савецкім войскам гэта было на руку.

Нягледзячы на тое, што падчас аперацыі «Кармаран» партызанскія фарміраванні істотна пацярпелі (паводле звестак Беларускага штаба партызанскага руху, за час блакады забітымі, палоннымі і зніклымі без вестак партызаны не далічыліся 2416 чалавек), цалкам знішчыць народных мсціўцаў не атрымалася. Калі ж верыць нямецкім дакументам, з 25 мая да 19 чэрвеня 1944 года страты партызан склалі 5520 забітымі і 2203 палоннымі. Тыя, каму пашчасціла выратавацца, дапамагалі чырвонаармейцам вызваляць беларускую зямлю ад ворага. Неўзабаве — 16 ліпеня — гэтыя партызаны, якія выжылі насуперак усяму, пройдуць пераможным строем падчас першага ў гісторыі партызанскага парада.

Па даных партызан, страты карнікаў склалі: забіта 3735 чалавек, паранена 2400, узята ў палон каля 1000. Аднак, на погляд многіх гісторыкаў, гэтыя лічбы завышаныя.

### ГАВОРАЦЬ СВЕДКІ

Яшчэ доўга пасля вайны аднаўляліся населеныя пункты, закранутыя аперацыяй «Кармаран». Дашчэнту абрабаваныя, яны практычна адбудоўваліся наноў. Многія вёскі так і не паўсталі з попелу. Апошнюю — Дальву, што ў Лагойскім раёне, — разам з яе жыхарамі знішчылі 19 чэрвеня 1944 года. У полымі загінулі 44 чалавекі. Да вызвалення заставаліся лічаныя дні...

Асабліва немцы лютавалі там, дзе неслі вялікія страты. Людзі хаваліся ў лясах і на астравах сярод балот. Пакінуць сваю хату быў вымушаны і жыхар вёскі Казлы Ільянскага раёна М. Кажура, сын і ўнук якога былі ў партызанах. Але нават у лесе пажылога мужчыну знайшлі гітлераўцы. Збіваў старога аднавясковец, які хацеў даведацца, дзе знаходзяцца партызаны. «Я стаў, акружаны ўзброенымі паліцэйскімі і батальёнцамі, і нічога не адказаў, тады нехта крыкнуў: «Камандзір ротны, ідзі хутчэй сюды, мы злавілі бандыта». Праз некаторы час да месца майго затрымання прыйшоў камандзір роты батальёна Беларускай краёвай аховы З. (імя, імя па бацьку не ведаю) з вёскі Забор'е, і мяне павялі пад аховай на паляну, адкуль — не магу сказаць, хто стаў клікаць жандармаў, якія тут жа з'явіліся ў колькасці двух чалавек. Ім сталі даказваць, што я з'яўляюся бандытам (партызанам), што мае дзеці такія. Пасля гэтага батальёнцы і паліцэйскія разамкнуліся і мне сказалі: «Ідзі наперад». Я пайшоў, і раптам ззаду мяне пачуўся выстрал, я ўпаў і страціў прытомнасць, у такім выглядзе праляжаў да раніцы наступнага дня. Апамятаўшыся, я пераканаўся, што паранены ў галаву, куля пашкодзіла патылічную частку чэрапа. У выніку ранення я страціў слых на правае вуха».

Падчас аперацыі «Кармаран» адбылася апошняя масавая адпраўка людзей на прымусовыя работы ў Германію. Сярод гэтых амаль 1400 чалавек апынулася і жыхарка вёскі Астрошыцы, што на Лагойшчыне, С. Баранчык. «Усяго з нашай вёскі выбралі 10 чалавек: васьмярых дзяўчат і дваіх мужчын. Усіх нас зачынілі ў хляве і нікога не падпускалі падыходзіць. Трымалі нас там цэлыя суткі, нічога не давалі есці, а таксама вады. Не далі магчымасці ўзяць з сабой харчаванне і адзенне. У хлеў да нас прыгналі яшчэ чалавек 60 дзяўчат і мужчын з вёсак Весніна, Манчакі, Рабрышчы і іншых. На другія суткі нас усіх накіравалі ў Германію. Там я працавала ва ўладальніка рэстарана, трывала ўсемагчымыя прыніжэнні і здзекі, пакуль не была вызвалена з рабства і не вярнулася дахаты».

Аб жахлівых зверствах акупантаў у дачыненні да партызан і мірных людзей расказваў партызан брыгады «Дубава» У. Мартынкевіч: «Мы з баямі пачалі адступаць да ракі Бярэзіны, а затым — у балоцістыя мясціны каля возера Палік, дзе былі акружаныя. Акрамя параненых, частка партызан была схоплена ў палон. Тыя, хто застаўся, у тым ліку я, праз балота сышлі ў лес, дзе вялі абаронныя баі да чэрвеня 1944 года. Коней, кароў і абоз з харчаваннем немцы забралі, параненых партызан, якіх мы не паспелі забраць з сабой, таксама. Спачатку здзекаваліся, а затым расстралялі. Найбліжэйшыя вёскі каля балота Палік былі спалены, жыхароў гэтых вёсак часткова сагналі ў Германію, часткова расстралялі. Грудных дзяцей зажыва кідалі ў агонь».

«Мірнае грамадзянскае насельніцтва, якое яны (немцы і іх памагатыя. — **Заўв. аўт.**) выганялі з вёсак, тулілася ў зямлянках, бо вёскі былі ўжо спалены, у полі, у лесе, прымаючы іх за партызан, усіх расстрэльвалі, зямлянкі спальвалі, — успамінаў партызан атрада «Бальшавік» Лагойскага раёна А. Шустоўскі. — Людзей, якія не паспелі выбрацца і збегчы ў поле, спальвалі проста ў зямлянках. Насельніцтва адпраўлялі ў Германію, але ў большасці ў нашай вёсцы насельніцтва і скаціну забівалі і палілі».

...Не хопіць нумара газеты, каб прывесці ўсе прыклады бесчалавечнасці фашыстаў у адносінах да беларусаў. Аднак мы не забыліся, на генным узроўні мы ўсё памятаем. Здзекам, якія ўчынілі з нашых продкаў на нашай зямлі акупанты, ніколі не будзе апраўдання.

**Веранiка КАНЮТА,
Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ,
кандыдат гістарычных навук.**



**Людзям, якім пашчасціла не трапіць у рукі да акупантаў, трэба было прыкласці яшчэ шмат намаганняў на шляху да нармальнага жыцця.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 40 (566)

# Цені Брэйгеля, бярозы Рушчыца...

Якімі карцінамі натхняліся беларускія паэты?

**Кажуць, у нашых далёкіх продкаў усе жанры мастацтва былі з'ядναныя. Сапраўды, нашто для рытуалу дзеля ўдалага палявання шукаць асобна спевака, кампазітара, музыку, танцора і мастака? Хто буйвала заваліць хоча — сам і станчыць, і спяе, і тую звярыну на сцяне пячоры намалюе...**

**Потым усё мастацтва стала высокім, складаным, прафесійным і раздраблёным. І, на жаль, нашы мастакі часам не чытаюць сваіх сучаснікаў-паэтаў, а апошнія рэдка завітваюць на выстаўкі ці на музычныя імпрэзы, збядняючы сябе. Але сапраўды таленавітыя заўсёды ведалі і натхняліся тым, што створана ў іншых мастацкіх жанрах. Давайце перачытаем творы беларускіх паэтаў, натхнёныя карцінамі.**



## Максім Багдановіч і Рафаэль

Максім Багдановіч, ведаючы пра смяротную хваробу, мала меў надзей на шчаслівае сямейнае жыццё, на вечнае каханне... Якое ўвасабляла для яго карціна Рафаэля Санці «Сікстінская мадонна». Копію менавіта гэтай карціны падарылі Адаму Багдановічу, бацьку паэта, сваякі яго другой жонкі, Аляксандры Волжынай (Адам Рыгоравіч і Максім Горкі нейкі час былі жанатыя на сёстрах Волжыных). Карціну Багдановічы бралі з сабою падчас усіх пераездаў. Кажуць, што Адам Рыгоравіч, як прагрэсіўны чалавек, не меў у доме абразоў — і «Сікстінская мадонна» стала для юнага Максіма гэткім нябесным знакам. Гэты вобраз можна ўгледзець шмат у якіх яго вершах. Калі Максім пасля доўгага перапынку прыехаў на родную Беларусь, пад уражаннем жыцця ў фальварку «Ракуцёўшчына» напісаў паэму «У вёсцы», дзе намаляваў вобраз вясковай мадонны. Героі паэмы натрапіў на маленькага хлопчыка, які спалохаўся мінака і папоўз да сваёй няньки — васьмігадовай дзяўчынкі, магчыма, сястры:

*І, як схіляецца ад ветра верх бярозкі,*
*Дзяўчынка к хлопчыку нагнулася і, слёзкі*
*Сціраючы яму, штосьць пачала казаць,*
*Каб заспакоіць плач — зусім як быццам маць,*
*І саліваліся ў жывы абраз ядыны*
*Той выгляд мацяры ды з воблікам дзяўчыны —*
*Дзіцячым, ціхенькім; і ў гэты час яна,*
*Здавалася, была аж да краёў паўна*
*Якойсь шырокаю, радзімаю красою,*
*І, помню, я на міг пахарашэў душою.*
*А можа, не краса была ў дзяўчынцы той, —*
*Дзяўчынцы ўпэцканай, і хілай, і худой, —*
*А штосьць вышэйшае, што Рафаэль вялікі*
*Стараўся выявіць праз Маці Божай лікі.*

## Максім Танк і Фердынанд Рушчыц

Малады Максім Танк, які чытаў у віленскіх салонах вершы і працаваў на падпольныя беларускія выданні, не быў далёкі ад культурнага жыцця... Ён добра ведаў мастакоў, бачыў выстаўкі... Пра яго захапленне мастацтвам сведчаць многія творы, напрыклад, паэма «Люцыян Таполя», пра разьбяра, які «Уздоўж Віллі і Нёмна // І па ўсіх шляхах і скрыжаваннях // Будаваў капліцы і крыжы, //



Выразаў апосталаў, прарокаў, // Больш падобных да сялян смаргонскіх, / /Да вілейскіх лесарубаў, рыбакоў».

Ёсць у Танка напісаны ў 1946 годзе верш, дзе згадваецца карціна Фердынанда Рушчыца «Балада» — менавіта яе ўспомніў паэт, сузіраючы восеньскі пейзаж... Цікава, што карціна тая, напісаная Рушчыцам у беларускім Багданаве ў 1898 годзе, загінула падчас вайны, у 1944-м. Ёсць толькі яе эскіз. Максім Танк відавочна бачыў яе арыгінал. Змрочны краявід, бярозы, з якіх вецер зрывае лісце, прыводзяць на памяць сяброў, што згінулі хто ў віхурах вайны, хто ў польскіх засценках, хто ў сталінскіх лагерах.

*...Стары гасцінец асамотнены.*
*З бяроз чырвоны ліст цярушыцца.*
*І вее ў твар вятрамі слотнымі*
*Бы з казачнай «Балады» Рушчыца.*
*Куды ў тахмуры гэткі дзень ісці?*
*Дзе захінешся, куды дзенешся?*
*І дрэвы нат ад безнадзейнасці*
*Кідаюцца ў азёры верасня.*
*А мне шкада іх. З кожным дрэвам я*
*Дружыў. Яны шумелі некалі*
*Над сном маім і над напевамі,*
*Над пройдзенымі мною рэкамі.*
*І я крычу ім: — Што вы робіце?*
*Няўжо вас дождж пазбавіў розуму?*
*Я рукі вам падам, і ў золаце*
*Вы зноў шуміце над бярозамі!*
*Іх ратаваў, як мог, дзень цэлы я.*
*І вось яны над шляхам высяцца,*
*І стройныя ствалы іх белыя*
*У чырвані лістоў калышуцца.*



## Уладзімір Караткевіч і Пітэр Брэйгель

